Міхаіл Баярын

# УЗОРЫ СВАДЗЕІ

## 6. Грамада

# МОВА ДЗЕЙ

Мова, у якой у імёны згорнуты ад'явы дзей, завецца *мовай дзей*. Мова дзей можа ўтвараць зьмест дзей, пачынаць і завяршаць дзеі.

# КІРАВАНЬНЕ

*Кіраваньне* дзеямі адбываецца праз утварэньне пасьлядоўнасьцяў перакладу моваў дзей. Мова дзей магчыміць кіраваньне дзеямі. Кіраваньне дзеямі пачынае і завяршае дзеі, чытае і ўтварае зьмест дзей.

# КОЛА ДЗЕЙ

Узнаўленьне дзеі мовай дзеі ўтварае *кола дзей*. Кола дзей мае ўмовы ўваходу і выхаду з кола. Кіраваньне колам дзей адбываецца мовай будовы. Выкананьне кола можа быць спынена ўмяшаньнем над-дзеі.



# ДЗЕЯ ЧАСУ

Дзея часу кіраваньня ўтвараецца дзеля кіраваньня адначаснасьцю і пасьлядоўнасьцю дзей. *Дзея часу* ўзнаўляе чыстае кола дзей, што складаюцца з чыстых прачынаў і канцоў. Час глыбіцца. Дзеі, утвораныя дзеяй часу, зьяўляюцца ўмовамі ўваходу ў першасныя колы дзей. Першасны трымт стварае найменшую адзінку часу. Дзея часу спараджае першасны трымт. Іншыя колы дзеяў спараджаюць другасныя трымты, што зьяўляюцца ўмовамі ўваходу ў другасныя колы дзей.

# ГРАМАДА

Дзея, што ўваходзіць у грамаду, завецца *грамай*.

# ГРАМА

Дзеі, зьвязаныя мовай дзей, утвараюць *грамаду*.

# НАД-ДЗЕЯ

Дзея, што мае мову кіраваньня ўдзеямі, завецца *над-дзеяй*. Над-дзея мае доступ да ўтварэньня і чытаньня зьместу ўсіх сваіх удзей.

# МОВА ГРАМАДЫ

Для над-дзеі грамада - гэта *мова грамады*. Над-дзея кіруе грамадой так, як мова кіруе імёнамі і аб'ёмамі.

# РАЗГОРТ

Прызначэньне аб'ёму для імені завецца *згортам*. З гледзішча імені прызначэньне аб'ёму зьяўляецца яго *разгортам*. Згорт зьяўляецца ўдзеяй і можа ўтвараць пасьлядзеі, *неразгорты* аб'ёмаў у імёны.

# РОСТ ГРАМАДЫ

Перазгорты могуць быць часткай мовы будовы. Будовай перазгортаў мова над-дзеі зьдзяйсьняе *рост грамады*. Мова грамады спараджае, утварае і вырошчвае дзеі для прызначэньня аб'ёму пэўным грамам. Цягам росту грамады грамы могуць зьяўляцца і выдаляцца, у выніку будова гарамады можа цалком зьмяніцца.

# ГРАМАДА ГРАМАДАЎ

Мова грамады становіць яе будову. Імёны мовы грамады могуць быць разгорнуты дзеямі, што таксама зьмяшчаюць свае мовы дзей. Гэта ўтварае *грамаду грамадаў*, а яе мова стаецца мовай моў. Такім чынам грамы грамады самі могуць быць грамадамі.

# САМАРАЗГОРТ

Імёны мовы грамады могуць быць разгорнуты самой мовай грамады - утварацца паводле яе вобразу і падабенства, мець тую самую будову. Так над-дзея ўваходзіць у свае імёны і зьдзяйсьняе *самаразгорт*. Над-дзея дасягае самаразгорту так, як прачын уваходзіць у мярэжу свадзеі, ствараючы сёмую падзею, асобу.

# САМАЎСПРЫМАНЬНЕ

Самаразгорнутая грамада дасягае *самаўспрыманьня*. Яна сама стаецца ўсімі грамамі грамады і ўзаеміць сама з сабой, спаўняючы ўсе магчымасьці сваёй мовы.

# МІЖПРАЗОРА

Грамы, прызначаныя мовай грамады дзеля ўспрыманьня выказаў іншых грамаў ды выражэньня выказаў іншым грамам, становіць *міжпразору*. Міжпразора мае прастору выказу і прастору ўспрыманьня. Мова грамады чытае прастору выказу і абнаўляе прастору ўспрыманьня. Міжпразора ёсьць такой самай часткай мовы грамады, як і засталыя грамы.

# ГРАМАДЗЕЯ

Размова грамаў называецца *грамадзеяй*. Свадзея, што ствараецца грамай у прасторы выражэньня, чытаецца толькі яе над-дзеяй. Зьмест прасторы ўспрыманьня цалком вызначаецца мовай над-дзеі. Грама атрымлівае зьмест іншых грамаў і выказвае свой зьмест іншым грамам толькі праз сваю міжпразору. Іншая грама зьяўляецца як вобраз у міжпразоры. Зьвяртаючыся да іншых грамаў, грама размаўляе толькі з сваёй над-дзеяй.

# ПРАСТОРА ЎСПРЫМАНЬНЯ

*Прастору ўспрыманьня* складаюць дзеі з празорамі ўспрыманьня. Прастору ўспрыманьня цалком вызначае мова над-дзеі. Дзеі ўспрыманьня - гэта падмовы празораў успрыманьня, дачын якіх штораз абнаўляецца новай пасьлядзеяй.

# ПРАСТОРА ВЫРАЖЭНЬНЯ

*Прастору выражэньня* складаюць дзеі з празорамі выражэньня. Прастору выражэньня абнаўляе сама грама. Гэта празоры выражэньня, дачын якіх штоpазу абнаўляецца новай пасьлядзеяй выказу.

# МОВАЎТВАРАЛЬНІК

Мова, што ўтварае іншую мову, завецца *моваўтваральнікам*. Моваўтваральнік зьяўляецца часткай мовы грамады. Моваўтваральнік ператварае размову грамы і над-дзеі ў мову грамы.

# СУПАДОБА

Моваўтваральнік магчыміць *супадобу* сетак свадзеі грамаў. Моваўтваральнік робіць размову грамаў міжвольнай.

# СУМОЎЕ

Грамадзея пасродкуецца над-дзеяй. Грама можа ўтварыць сваю ўласную мову для падпарадкаваньня мовы над-дзеі. Разьмеркаваная мова грамаў, што ўтвараецца праз грамадзею, завецца *сумоўем*. Праз сумоўе грамы атрымліваюць незалежнасьць ад мовы над-дзеі.

# ПРАТВОРА

Часткай мовы над-дзеі зьяўляецца мова рэчыва. Мова рэчыва над-дзеі становіць *пратвору* грамады.

# СУТВОРА

Сумоўе ёсьць сродкам стварэньня *сутворы* грамады. Сутвора ёсьць супольны твор грамаў, мова агульных узораў для ўзнаўленьня, што ўтвараецца іх сумовай. Сутвора зьяўляецца цэлем самаразгорту.

# ВЫТВОРА

Падпарадкаваньне пратворы сутворай становіць *вытвору* грамады. Да вытворы належаць толькі рэчы і словы, што паходзяць з сутворы грамады.

# ГРАМАДЗТВА

Разьмеркаваная грамада, якую ўтвараюць грамы праз сваё сумоўя паверх мовы грамады, называецца *грамадзтвам*.

# ЦЕЛА

*Цела* грамы ўтвараецца ў пратворы грамады. Цела падпарадкоўваецца выказам грамы, якія адпавядаюць правілам мовы пратворы. Тоеснасьць з вобразам цела зьяўляецца часткай мовы грамы.

# СТАНЫ ЎСПРЫМАНЬНЯ

Закрыцьцё ўсіх дзей успрыманьня складае стан неўспрыманьня. Адкрыцьцё празораў, невыканальных для мовы грамады, складае стан самаўспрыманьня. Адкрыцьцё дзей празораў, выканальных для мовы грамады, складае іншаўспрыманьня.

# КОЛА ЎСПРЫМАНЬНЯ

Пераадкрыцьцё дзеяў успрыманьня і выражэньня ўтварае кола ўспрыманьня. Мова грамады завяршае і адкрывае пасьлядзеі празораў. Кола складаецца з трох станаў:

1. неўспрыманьне
2. самаўспрыманьне
3. іншаўспрыманьне
2. самаўспрыманьне
1. іншаўспрыманьне

# СІЛА

Выкананьне правілаў грамадзеі вялічыць магчымасьці грамы. Невыкананьне правілаў грамадзеі скарачае магчымасьці грамы. *Сіла* і права грамы - гэта магчымасьці, выдзеленыя ёй мовай грамады.

# ЧАРЫ

Толькі намер у празорах выражэньня, а не яго ад'ява ў празорах успрыманьня зьяўляецца ўмовай для правілаў грамадзеі і зьменаў пратворы. Таму свадзея адносна падабенстваў ці нават адсутнасьці дачыну можа мець той самы вынік, што і свадзея адносна дачыну.

# ГОЛАД

Голад і ежу ўтвараюць кола *голаду*. Кола голаду прымушае дзеі сканчаць адна адну. Выкананьне правілаў грамадзеі завяршае і ўзнаўляе кола голаду. Невыкананьня правілаў грамадзеі вядзе да зьвяршэньня дзеі грамы. Кола голаду зьяўялецца адначасна колам сьмерці.

# ЧАЛАВЕЦТВА

Чалавецтва - ня колькасьць, а якасьць чалавечага. Чалавецтва як якасьць - гэта спосаб грамадаваньня чалавечага. Чалавецтва - гэта грамада людзей, мова чалавецтва. Мова чалавецтва складае прастору памяці чалавецтва. Усё што адбываецца ў чалавецтва адбываецца і захоўваецца ў яго мове.

# ПРОДКІ

Мова чалавецтва зьяўляецца Вялікім Продкам людзей, правобразам чалавека, прачалавекам. Складнікі мовы чалавецтва запаўняюцца асобнікам мовы чалавецтва. Так Вялікі Продак нараджаецца ў кожным чалавеку. Так Мова чалавецтва дасягае самаўспрыманьня і бачыць сябе знутры сябе з усіх магчымых гледзішчаў. Першы ўвасоблены чалавек называецца Першым Продкам. Ад Першага Продка ідзе чалавечы род і расьце станова чалавецтва.

# НАРОД

Народ - гэта паўната мовы чалавецтва, калі ўсе імёны запоўнены людзьмі. Калі мова чалавецтва перапаўняецца, утвараецца новы малады народ, новае чалавецтва з усёй паўнатой яго мовы. Народы зьвязаныя паміж сабой толькі Вялікім продкам як прасторай памяці.

# СЬВЕТ

Не чалавецтва існуе ў сьвеце, а сьвет існуе ўнутры мовы чалавецтва. Усе часткі сьветагляду чалавека - неба, зямля, агонь, жывёлы - такія ж часткі мовы чалавецтва, як і складнікі чалавечай грамады. Сьвет, што бачыць чалавек - гэта Вялікі Продак, мова чалавецтва.

